## ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

З кожнай сесіяй на біялагічным факультэце павялічваецца колькасць студэнтаў, якія здаюць экзамены толькі на выдатна і добра.

Сярод тых, хто заўсёды старанна і сур'ёзна адносіцца да вучобы, і Люда Прошчанка. Яе, студэнтку чацвёртага курса, адну з лепшых на факультэце, вы і бачыце на здымку нашага фотакарэспандэнта Г. Марозава.




ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (736) ● Пятніца, 28 лютага 1969 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXII


## У ГОНАР ВЯЛІКАГА БАЙКАПІСЦА

На філалагічным факультэце прайшлі дні, прысвечаныя 200-годдзю байкапісца І. А. Крылова. У факультэцкім друку выступілі студэнты і выкладчыкі з матэрыяламі аб пісьменніку. Сярод іх выкладчык Іван Сцяпанавіч Шпакоўскі, студэнт факультэта журналістыкі Віталій Груздзеў. Пераклады баек зрабіла Жэня Янішчык. А работнікамі бібліятэкі падрыхтаван стэнд, дзе сабраны творы вялікага байкапісца: п'есы, вершы, байкі. Ёсць тут манаграфіі Н. Л. Сцяпанава, І. Сяргеева і іншых даследчыкаў аб Крылове.

Журналістаў у юбілейныя дні Крылоў цікавіць як журналіст. Таму некаторыя студэнты другога курса ўзялі тэмы курсавых работ па гісторыі рускай журналістыкі, якія звязаны з дзейнасцю Крылова-журналіста.

А днямі адбылося пасяджэнне навуковага таварыства, дзе студэнты выступілі з дакладамі і паведамленнямі аб Крылове.

Даклады «Журналісцкая дзейнасць Крылова», «Сатырычная проза Крылова», «Народнасць творчасці Крылова» прачыталі студэнты Толоцік, Клябанава, Зайцава. Студэнтка Зарэмба расказала аб творчасці Лафантэна і Крылова. Яна выявіла агульнае ў іх байках шляхам супастаўлення, паведаміла аб уплыве, які зрабіў на Крылова Лафантэн. Зайцава пераклала байкі Лафантэна з французскай на рускую мову.

Вадзім Шаршоў расказаў прысутным аб уплыве Крылова на ўкраінскага байкапісца Глібава. Некаторыя вытрымкі з баек Глібава ён чытаў на ўкраінскай мове. Паведамленне так і называлася «Глібаў і Крылоў».

Асабліва цікавым быў расказ Валі Прывалавай пра Эзопа і Крылова. Ала Клок расказала, які уплыў аказаў І. А. Крылоў на беларускую літаратуру, паведаміла, хто займаўся перакладамі баек Крылова на беларускую мову.

У заключэнне прысутным была прапанавана віктарына «Крылоў у Беларусі», якую падрыхтаваў Алег Трызна.

А. Хазянін.

## НА ПАВЕРЦЫ — ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

**Партыйная арганізацыя гістарычнага факультэта з'яўляецца галаўной ва універсітэце па падрыхтоўцы да выбараў. Днямі тут адбыўся партыйны сход, які абмеркаваў удзел камуністаў і камсамольцаў у правядзенні гэтай важнай палітычнай кампаніі.**

**Дакладчык, член партбюро дацэнт У. А. Ціток, і выступіўшыя ў спрэчках адзначылі, што гістфакаўцы з поўнай адказнасцю аднесліся да даручанай справы. З 26 студзеня пачаў работу агітпункт выбарчага ўчастка № 1 Ленінскага раёна. Тут рэгулярна чытаюцца лекцыі для выбаршчыкаў, арганізуюцца канцэрты, праводзяцца іншыя мерапрыемствы. Вялікая растлумачальная работа вядзецца па месцу жыхарства працоўных. Пяцьдзесят чатыры агітатары, сярод якіх нямала аспірантаў, маладых выкладчыкаў, штодзённа нясуць пачэсную вахту. У Ленінскім раёне яны першымі падрыхтавалі спісы выбаршчыкаў. Наперадзе — вялікая работа па агітацыі за вылучаных кандыдатаў у раённы, гарадскі і абласны Саветы. Партыйны сход даручыў партбюро шырэй прыцягваць да гэтай работы студэнтаў. Станоўчы вопыт тут ёсць. Як адзначыў у сваім выступленні Ф. Лазюк, студэнты трэцяга курса аддзялення філасофіі прачыталі шэраг лекцый для медыцынскіх работнікаў, падрыхтавалі даклады па праблемах сучаснага мастацтва.**

**На сходзе падкрэслівалася, што пачэсны абавязак камуністаў і камсамольцаў — сустрэць выбары выдатнымі поспехамі ў вучобе, навукова-даследчай і прапагандысцкай рабоце. Аб гэтым гаварылі прафесар Ф. М. Нячай, аспірант І. Д. Стадуб і іншыя. Было адзначана, што падрыхтоўка да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна накладвае свой адбітак на перадвыбарную кампанію. Гэта асабліва адчуваецца на гістфаку. Тут усе выкладчыкі рыхтуюць лекцыі па ленінскай тэматыцы і, акрамя таго, выступілі з пачынам — узялі на сябе абавязацельства падрыхтаваць дакладчыкаў па ленінскай тэматыцы з ліку студэнтаў. Ініцыятыва падтрымана на ўсіх факультэтах універсітэта. Да таго ж гэты вопыт зацікавіў актывістаў інстытутаў Мінска.**

**Падрыхтоўка да выбараў уступае ў новы этап. Гісторыкі поўныя рашучасці паспяхова выканаць абавязак, які ўскладзен на галаўную партарганізацыю.**

## КАМУНІСТЫ АБ КАМСАМОЛЬЦАХ

У мінулую сераду адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход, на якім было абмеркавана пытанне аб становішчы камсамольскай работы ва універсітэце і паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам. З дакладам выступіла сакратар парткома Т. Я. Дударава.

У абмеркаванні гэтага пытання прынялі ўдзел сакратар партбюро геолага-геаграфічнага факультэта Ф. Фешчанка, намеснік сакратара партбюро гістфака У. Ціток, сакратар камсамольскай арганізацыі матфака Л. Прокушава, дэкан фізфака І. Зяцькоў, групкамсорг з філасофскага аддзялення Л. Жывадрова, сакратар партбюро юрфака С. Драбязка, сакратар камітэта камсамола М. Ціва.

У прынятым сходам рашэнні дана ацэнка работы універсітэцкай камсамольскай арганізацыі і намечаны мерапрыемствы па узмацненню і ўдасканаленню партыйнага кіраўніцтва камсамолам.

## САВЕЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ СІСТЭМА

У ДАПАМОГУ АГІТАТАРУ

16 сакавіка 1969 года ў нашай рэспубліцы будуць праходзіць выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных — у самыя шматлікія, найбольш блізкія да насельніцтва тэрытарыяльна органы дзяржаўнай улады ў нашай краіне, якія працуюць у поўным сэнсе ў гушчыні народных мас.

Важнейшай задачай мясцовых Саветаў з'яўляюцца клопаты аб задавальненні розных патрэб насельніцтва. Жыллёвае будаўніцтва, гандаль, грамадскае харчаванне, работа мясцовага транспарту, выпуск тавараў народнага ўжытку, народная адукацыя, ахова здароўя, арганізацыя бытавога абслугоўвання насельніцтва, забеспячэнне грамадскага парадку — такі далёка не поўны пералік пытанняў, якімі паўсядзённа займаюцца мясцовыя Саветы і іх органы.

Ідэолагі буржуазіі напісалі нямала кніг, у якіх імкнуліся даказаць, што нібы народная маса сляпая і няздольная кіраваць дзяржавай. Кіраваць грамадскім жыццём, на іх думку, могуць толькі «вышэйшыя» класы. Савецкая дзяржава рабочых і сялян за 51 год свайго існавання наглядна паказала ўсяму свету, якіх небывалых вышынь ва ўсіх галінах працоўнага і грамадскага жыцця, могуць дасягнуць працоўныя, вызваленыя ад эксплуатацыі, якія валодаюць прыладамі і сродкамі вытворчасці, усімі багаццямі краіны і якія самастойна здзяйсняюць кіраўніцтва эканамічным, палітычным і культурным жыццём краіны.

Вось лічбы толькі аднаго года. У 1968 годзе ў нашай краіне было выпрацавана 638 млрд. кв/ч электраэнергіі, здабыта 309 млн. тон нафты, 594 млн. тон вугалю, выплаўлена 78,8 млн. тон чыгуну і 107 млн. тон сталі. Насельніцтва СССР атрымала з грамадскіх фондаў спажывання выплат і льгот на суму 55 млрд. рублёў, або на 11 працэнтаў больш, чым у 1967 годзе, у тым ліку ў БССР — 1,7 млрд. рублёў, або на 12 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе.

У СССР ў 1968 годзе каля 11 млн. чалавек перасяліліся ў новыя дамы, а таксама палепшылі свае ўмовы ў раней пабудаваных дамах, у тым ліку ў БССР — каля 370 тысяч чалавек.

З першых жа дзён Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі У. І. Ленін — правадыр Камуністычнай партыі і арганізатар Савецкай дзяржавы вылучыў задачу — дабіцца таго, каб у нашай краіне кожны рабочы, селянін, працоўны вучыўся кіраваць дзяржавай і ўдзельнічаў у паўсядзённай будзённай рабоце па кіраванню дзяржаўнымі справамі.

Адной з важнейшых і найбольш шырокіх форм прыцягнення працоўных да кіравання справамі дзяржавы служаць выбары ў Саветы дэпутатаў працоўных, якія праводзяцца на аснове паслядоўна дэмакратычнай савецкай выбарчай сістэмы. Выбары ва ўсе Саветы дэпутатаў працоўных, пачынаючы ад сельскага, пасялковага Савета і канчаючы Вярхоўным Саветам СССР, праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Яны сапраўды ўсеагульныя: у іх удзельнічаюць усе грамадзяне, якія дасягнулі да дня выбараў 18-гадовага ўзросту, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, веравызнання, адукацыйнага ўзроўню, аселасці, сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці. Кожны грамадзянін СССР, які дасягнуў 18-гадовага ўзросту, можа быць выбран дэпутатам мясцовага Савета. Дэпутатам Вярхоўнага Савета аўтаномнай або саюзнай рэспублікі можа быць выбран кожны грамадзянін, які дасягнуў 21 года. І дэпута-

(Заканчэнне на 3-й стар.).



16-я вучэбная група падрыхтоўчага факультэта (выкладчык А. С. Ляцецкая) па здачы зімовай сесіі заняла адно з лепшых месц. Усе студэнты гэтай групы здалі экзамены на выдатна і добра.

**На здымку:** студэнты 16-й групы Та Зуі Кыонг (злева) і Нгуен Тхань Тао.

Фота М. Нічыпарэнкі.

# ЛЕНІНСКІ ЗАЛІК

**На мінулым тыдні адбыўся сход-мітынг камсамольскага актыву універсітэта, на якім быў прынят зварот да камсамольцаў і ўсіх студэнтаў БДУ разгарнуць актыўную падрыхтоўку да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У гэтым дакуменце падкрэсліваецца, што камсамолія нашага універсітэта з'яўляецца адным з баявых атрадаў многамільённай арміі савецкай моладзі, які ўжо шмат зрабіў па выкананню пастановы ЦК КПСС аб падрыхтоўцы да слаўнага юбілею.**

**Удзельнікі сходу-мітынгу заклікалі студэнтаў яшчэ глыбей вывучаць тэарэтычную спадчыну У. І. Леніна. З гэтай мэтай вырашана часцей арганізоўваць навукова-практычныя і тэматычныя канферэнцыі, сустрэчы з прадстаўнікамі ленінскай гвардыі, лекцыі вядучых вучоных-грамадазнаўцаў. Актывісты звярнуліся з просьбай да рэктарата узаконіць грамадска-палітычную практыку студэнтаў на ўсіх факультэтах. Вынікі такой практыкі будуць падводзіцца ў камсамольскіх групах з удзелам супрацоўнікаў кафедр і прадстаўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў, у калектывах якіх студэнты будуць весці грамадска-палітычную работу. З дапамогай кафедр грамадскіх навук распрацоўваецца цыкл лекцый на тэмы: «Ленін — рэвалюцыянер», «Ленін — філосаф», «Ленін—палітык», «Ленін — эканаміст», «Ленін — правадыр народа», «Ленін — публіцыст». Гэтыя лекцыі будуць чытацца для студэнтаў кожнага факультэта, пасля чаго адбудзецца «Ленінскі залік».**

**«Камсамольцы 20-х гадоў пастаянна ўмацоўвалі сувязі з рабочымі і калгаснікамі, — гаворыцца ў звароце, — развілі слаўныя традыцыі шэфскай работы. І сёння мы звяртаемся да ўсіх студэнтаў узяць шэфства над школамі Мінскага і Дзяржынскага раёнаў, стварыць там пастаянна дзейнічаючыя кансультацыйныя пункты, прачытаць цыкл лекцый па ленінскай тэматыцы, арганізаваць выезды канцэртных брыгад у школы і экскурсіі школьнікаў ва універсітэт, накіраваць 1.000 студэнтаў у сельскія школы ўсіх раёнаў Беларусі з прапагандай дасягненняў старэйшай навучальнай установы рэспублікі — БДУ, які з гордасцю носіць імя У. І. Леніна».**

**У звароце падкрэсліваецца вялікае выхаваўчае значэнне арганізацыі студэнцкіх камуністычных суботнікаў, адзначаецца таксама неабходнасць далейшага развіцця лепшых традыцый універсітэта па выхаванню моладзі ў духу інтэрнацыяналізму і дружбы з моладдзю і працоўнымі ўсяго свету. У 1970 годзе ў гонар слаўнага юбілею і ў памяць аб загінуўшых выкладчыках і студэнтах у гады Вялікай Айчыннай вайны ва універсітэцкім скверы будзе адкрыт помнік.**

**У заключэнне ў звароце гаворыцца: «Мы і далей будзем настойліва вывучаць вялікую рэвалюцыйную навуку — марксізм-ленінізм, гісторыю нашай слаўнай Камуністычнай партыі...»**



# ПРАПАГАНДА ВЯЛІКАЙ СПАДЧЫНЫ ІЛЬЧА

Вучоны савет і партыйны камітэт распрацавалі мерапрыемствы па прапагандзе тэарэтычнай спадчыны У. І. Леніна. Цяпер звыш 400 прафесараў і дацэнтаў рыхтуюць даклады па ленінскай тэматыцы. Многія з іх ужо выступаюць з лекцыямі перад працоўнымі рэспублікі аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці правадыра, аб тым, як здзяйсняюцца яго запаветы. Важнае месца ў падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна займае прапаганда поспехаў беларускага народа ў развіцці эканомікі, навукі і культуры за гады Савецкай улады.

Прафссар У. М. Сікорскі падрыхтаваў тэму «У. І. Ленін — геніяльны прадаўжальнік справы і вучэння Карла Маркса і Фрыдрыха Энгельса». Гістарычную ролю У. І. Леніна ў стварэнні БССР і КПБ асвятліў у падрыхтаваным матэрыяле прафесар М. Я. Шкляр. Напісалі распрацоўкі па ленінскай тэматыцы дацэнты І. П. Кахно, В. П. Васін, В. А. Дарогін і іншыя.

Ва універсітэце вядзецца вялікая падрыхтоўка студэнтаў-лектараў. Ужо каля 400 чалавек працуе над тэмамі. Значную дапамогу ім аказваюць выкладчыкі. Звыш 70 прафесараў і дацэнтаў узялі на сябе абавязацельства кожнаму падрыхтаваць некалькі студэнтаў для выступленняў перад працоўнымі. Дарэчы, 35 студэнтаў гістарычнага факультэта ўжо выступілі ў цэхах станкабудаўнічага завода імя Кірава і ў школе № 24 па тэме «Гістарычная роля У. І. Леніна ў стварэнні БССР і Камуністычнай партыі Беларусі».

Выкладчыкі універсітэта акажуць партыйным арганізацыям прадпрыемстваў, устаноў і школ дапамогу ў правядзенні шэрагу мерапрыемстваў, звязаных з юбілеем, прымуць удзел у тэарэтычных канферэнцыях на Мінскім і Беларускім аўтамабільных заводах, у Барысаўскім, Чэрвеньскім і Смалявіцкім раёнах.

# МАСТАЦТВА — НАРОДУ

У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта пад дэвізам «Мастацтва — народу» 9 красавіка пачынаецца агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. У «Палажэнні» аб правядзенні агляду вызначаны яго асноўныя задачы. Сярод іх — шырокая дэманстрацыя сродкамі мастацтва дасягненняў, з якімі падыходзіць партыя і савецкі народ да ленінскага юбілею, далейшае развіццё мастацкай самадзейнасці, прыцягненне новых сіл у рады яе ўдзельнікаў, павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню творчасці студэнтаў. развіццё ўсіх відаў і жанраў самадзейнага мастацтва.

Агляд будзе садзейнічаць папаўненню рэпертуару новымі творамі літаратуры, драматургіі і музыкі, якія адлюстроўваюць гістарычны шлях савецкага народа ў пабудове камуністычнага грамадства.

Вызначан тэрмін правядзення агляду:

9 КРАСАВІКА — фізічны факультэт (18.00), хімічны (19.30), гістарычны (21.00);

12 КРАСАВІКА — юрыдычны факультэт 18.00), матэматычны (19.30), біялагічны факультэт (21.00);

13 КРАСАВІКА — філалагічны факультэт (10.00), падрыхтоўчы (11.30), журналістыкі (13.00), геолага-геаграфічны (14.30).

Права ўдзелу ў аглядзе прадастаўляецца самадзейным калектывам, якія дабіліся высокага выканаўчага і мастацкага майстэрства, драмгурткам, якія паставілі п'есу на сучасную, гісторыка-рэвалюцыйную або гераіка-патрыятычную тэму, тэатрам мініяцюр з праграмай, якая складаецца з твораў малых форм на сучасную тэму, прысвечаных жыццю і дзейнасці У. І. Леніна, аркестрам народных інструментаў, якія складуць праграму з лепшых узораў фальклору, класічных і арыгінальных твораў савецкіх кампазітараў (з беларускай тэматыкай), ансамблям танцаў, у праграме якіх — народныя танцы, сюжэтныя і тэматычныя нумары на гісторыка-рэвалюцыйную тэму.

Для эстрадных аркестраў, ансамбляў неабходна прысутнасць у праграме выбраных твораў савецкіх кампазітараў, якія адлюстроўваюць героіку і працу нашага народа. Агітацыйна - мастацкія брыгады павінны прадставіць праграму, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна і баявым традыцыям народа, вакальныя ансамблі і салісты ўсіх жанраў — канцэртную праграму з твораў савецкіх аўтараў або фальклору на гісторыка-рэвалюцыйную або сучасную тэму.

Створана журы ў складзе: А. Я. Малышаў — старшыня, члены журы — А. А. Галаўко, Г. Я. Рылюк, С. А. Лысенка, Л. Б. Сабалеўскі, М. Д. Ціва, М. А. Лісіцын, В. І. Раговіч, А. М. Озераў, Н. В. Лапша, В. Д. Літвінка, В. І. Галубовіч.

У заключэнне агляду лепшы калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, заняўшы першае месца, узнагароджваецца пераходным кубкам, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй; калектывам, заняўшым другое і трэцяе месцы, будуць уручаны Ганаровыя граматы і грашовыя прэміі.

Заахвочваюцца і лепшыя выканаўцы.

Праграмы конкурсных канцэртаў павінны быць прадстаўлены ў прафком БДУ да 5 красавіка 1969 года.

# ЗА ПРАВА НАЗЫВАЦЦА ЛЕПШЫМ

**Ужо стала традыцыяй у нашым універсітэце напярэдадні знамянальнай даты ў жыцці свайго народа праводзіць агляды-конкурсы. У гэтым годзе агляд-конкурс на лепшы інтэрнат праводзіцца ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Ён ставіць сваёй мэтай далейшае паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў у студэнцкіх інтэрнатах, паляпшэнне санітарнага становішча інтэрнатаў і вучэбных карпусоў, беражлівыя адносіны да сацыялістычнай маёмасці.**

**Акрамя гэтага, асноўнымі задачамі агляду з'яўляюцца таксама арганізацыя здаровага рэжыму разумовай працы і актыўнага адпачынку студэнтаў, развіццё ініцыятывы і самастойнасці, выхаванне пачуцця адказнасці за даручаную справу, клопаты аб калектыве, развіццё ў студэнцкім асяроддзі высокай культуры.**

**Агляд-конкурс праводзіцца рэктаратам і прафкомам у два этапы: першы — з 10 лютага па 1 мая, другі — з 1 мая па 7 лістапада 1969 года.**

**Адказнасць за выкананне ўмоў агляду-конкурсу ўскладзена на дэканаў факультэтаў, камендантаў і студэнцкія саветы інтэрнатаў, грамадскія арганізацыі універсітэта.**

**Для праверкі і падвядзення вынікаў рэктарам назначана камісія (старшыня — І. А. Ожыгін, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце). У яе склад уваходзяць прадстаўнікі рэктарата, парткома, прафкома, камітэта камсамола, каменданты інтэрнатаў.**

**Для пераможцаў установлены тры прэміі — у 300, 200 і 100 рублёў.**

**Прэміі могуць быць выкарыстаны студсаветамі на набыццё прадметаў культурнага ўжытку, а таксама для заахвочвання лепшых.**

**Конкурс аб'яўлен, і кожнаму члену інтэрнацкага калектыву трэба добрай справай прыняць у ім удзел і здабыць для свайго інтэрната права называцца інтэрнатам беражлівых, інтэрнатам узорнага парадку.**

**А. ЗЛОТНІКАЎ,**
**старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома.**

# ЖЫЦЦЁ, ЯК ФАКЕЛ

**Чалавек жалезнай волі. Чалавек, які поўнасцю аддаў сябе рэвалюцыі. Чалавек, што гарыць яркім полымем, без працы, у якую ўклаў сябе цалкам, не ўяўляе свайго жыцця.**

**Такой была Надзежда Канстанцінаўна Крупская, 100-годдзе з дня нараджэння якой ужо споўнілася. Педагог па прызванню, рэвалюцыянер па перакананасці, мужны і стойкі чалавек, верны друг і саратнік Ільіча, Надзежда Канстанцінаўна цалкам аддала сябе справе рэвалюцыі.**

**Лёс не песціў яе. Магчыма, ён нават быў і жорсткім. Ссылкі, эміграцыя, вечны неспакой за справу рэвалюцыі і за жыццё дарагога Ільіча... Такое незвычайнае жыццё пражыла Надзежда Канстанцінаўна.**

**Крупская была партыйным работнікам, партыйным публіцыстам, аддавала ўсю сябе будаўніцтву новай савецкай школы. Яна была жонкай, таварышам, саратнікам Леніна.**

**Жыццё, як факел. Жыццё, поўнае гарэння і барацьбы. Яна сёння — прыклад для моладзі ў справе служэння рэвалюцыі, народу, справе вялікага Леніна...**

# СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

Адбыўся пленум камітэта камсамола універсітэта, на якім разгледжаны пытанне аб становішчы унутрысаюзнай работы і мерапрыемствы па яе паляпшэнню на філалагічным і фізічным факультэтах. З дакладам выступіў намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце В. Наумчык. Разгледжаны пытанні арганізацыйнай работы ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў. Асаблівае месца ўдзелена рабоце груп, вызначаны канкрэтныя задачы па выпраўленню існуючых недахопаў.

У спрэчках па дакладу выступілі сакратар камітэта камсамола фізічнага факультэта Пётр Кухарчык, філалагічнага факультэта — Уладзімір Ганчароў, члены камітэта камсамола універсітэта Аляксандр Калымага, Іван Сідарэнка, члены бюро Мікалай Бондар, Міхаіл Шавыркін, сакратар камітэта камсамола універсітэта М. Ціва. У рабоце пленума прынялі ўдзел члены партбюро факультэтаў, сакратар парткома універсітэта Т. Я. Дударава.

Пленум прыняў адпаведную пастанову.

***

На чарговым сходзе членаў добраахвотных народных дружын універсітэта са справаздачным дакладам выступіў камандзір ДНД універсітэта І. І. Гапановіч. У спрэчках па дакладу выступілі камандзіры дружын факультэтаў, члены атрадаў ДНД. Падрабязна разгледжаны вынікі работы ў 1968 годзе, прааналізаваны недахопы, вызначаны асноўныя задачы камсамольскай арганізацыі: падбор студэнтаў у атрады, кантроль за дзяжурствам і перыядычнае заслухоўванне груп і курсаў аб нясенні дзяжурства па ахове грамадскага парадку.

У сходзе прынялі ўдзел намеснікі сакратароў партбюро факультэтаў па ідэалагічнай рабоце і намеснік сакратара парткома універсітэта Г. Я. Рылюк. На сходзе выбран новы састаў штаба.

***

Бюро камітэта камсамола падвяло вынікі работы НСТ і разгледзела пытанні па падрыхтоўцы да трэцяга Усесаюзнага конкурсу па праблемах грамадскіх навук у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, а таксама пытанні падрыхтоўкі да новага працоўнага семестра.

***

Бюро заслухала справаздачу інструктара-метадыста факультэта грамадскіх прафесій. Зроблены адпаведныя папрокі ў адрас камітэтаў камсамола факультэтаў і універсітэта, якія недастаткова ўдзялялі ўвагі рабоце факультэта. Выказана прапанова звярнуцца ў рэктарат з просьбай аб выбранні ў склад вучонага савета універсітэта дэкана факультэта грамадскіх прафесій.

Бюро разгледзела і арганізацыйныя пытанні.

# ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР — УДАРНЫ

**«У гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна працоўны семестр 1969 года аб'яўляецца УДАРНЫМ».**

(З пастановы пленума камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна ад 20 лютага 1969 года).

**СТУДЭНТ, цябе чакаюць будоўлі вобласці, гарадоў Беларусі, Казахстана. Запісвайцеся ў студэнцкія будаўнічыя атрады!**

**Заявы падавайце ў камітэты камсамола факультэтаў.**

# Біяфак

## РАБОЧЫ НАСТРОЙ ДРУГОГА СЕМЕСТРА

### РЭПАРТАЖ

Другі семестр для першакурснікаў — асаблівы. Засталіся ззаду першыя экзамены — пасвячэнне ў студэнты. Першая сесія прынесла ўпэўненасць у сваёй годнасці, першыя перамогі. Таму так радасна сустрэліся студэнты пасля канікул са сваімі выкладчыкамі, навуковымі лабараторыямі, з напружанымі днямі вучобы.

Вось ужо другія практычныя заняткі прайшлі ў біёлагаў першага курса па заалогіі беспазваночных. Але з такой цікавасцю яны прайшлі ўпершыню. Сапраўдная самастойная работа чакала іх у лабараторыі.

Уся трэцяя група ў поўным зборы. Адны дзяўчаты. Са смехам, жартамі, асаблівым задавальненнем апранаюць яны белыя халаты. Другія з цікавасцю разглядаюць інструменты, раскладзеныя на стале.

— Здаецца, нешта цікавае будзе, дзяўчаты,—не стрымліваецца адна з іх.

Гэта Валя Дзюндзікава, адна з лепшых студэнтак курса. Імкнучыся здагадацца, чым усё-такі яны будуць займацца, яна хуценька гартае практыкум па заалогіі.

...І вось Тэліна Іванаўна Запольская ўжо закончыла пераклічку. Крыху хвалююцца дзяўчаты: каму сёння прыйдзецца адказваць?

Выручае Дзюндзікава:

— Тэліна Іванаўна, можна, я?

Упэўнена гучыць голас студэнткі, і па лагоднай усмешцы выкладчыка можна зразумець, што ацэнка будзе высокай.

З палёгкай уздыхаюць астатнія. Самае складанае пытанне выяснена!

Цікава выступае Люда Гарэлік. Добра абгрунтаваны яе расказ спадабаўся ўсім.

Нарэшце аб'яўлена самае цікавае: тэма практычных заняткаў — анатаміраванне звычайнаї аскарыды. Хтосьці ўжо раскладвае інструменты на кожнае рабочае месца. Выкладчык пачынае тлумачыць. Цішыня. Толькі зрэдку:

— Тэліна Іванаўна, паглядзіце!

— А што гэта такое?

— Ой, а ў мяне нічога не атрымалася.

— Нешта рукі дрыжаць...

Хутка праляцелі дзве гадзіны. Сабраны інструменты на свае месцы, скончана работа. А ў вачах студэнтаў дапытлівая зацікаўленасць.

— Зусім мала часу застаецца да наступнай суботы... — раздаецца чыйсьці голас.

△

## АБ ТЫХ, ХТО ВЫСТАЯЎ

Пад такім загалоўкам у біялагічным корпусе аформлен фотастэнд. Ён прысвечан святу Савецкай Арміі. Стэнд цікава аформлен. Пад партрэтнымі здымкамі Герояў Вялікай Айчыннай вайны, чый лёс звязан з гісторыяй нашага універсітэта, невялікія гістарычныя даведкі, кароценькія выступленні саміх удзельнікаў вайны. Сярод іх дэкан факультэта П. Г. Пятровіч, дацэнт кафедры гісторыі КПСС М. Я. Гракаў, Б. Ф. Осіпаў—дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл і іншыя.

Пры падрыхтоўцы стэнда выкарыстаны матэрыялы факультэцкай насценгазеты «Віта».

З. ШЭЙНА,
студэнтка II курса журфака.

# Журфак

## ХАТЫНЬ НЕ ЗАБЫЦЬ

Марознай сонечнай раніцай 23 лютага студэнты другога курса факультэта журналістыкі арганізавалі паездку ў Хатынь. Сабраліся каля гуманітарнага корпуса. Аўтобус ужо даўно чакаў сваіх пасажыраў... Але вось і Хатынь! Чорны надпіс адразу прыгнятае, навявае сум.

Падыходзім да мемарыяльнай дошкі, якая расказвае аб тым, што 23 сакавіка 1943 года карны фашысцкі атрад спаліў вёску і 154 яе жыхары.

Цяпер на месцы дамоў стаяць каміны са званамі, скупыя надпісы на іх знаёмяць нас з былымі жыхарамі вёскі. А там, дзе ў нечалавечых муках паміралі людзі, пастаўлен помнік.

У суровым маўчанні застылі будучыя журналісты. Кожны задумаўся аб нечым сваім і, магчыма, пакляўся ў душы зрабіць штосьці важнае, патрэбнае людзям, каб трагедыя Хатыні больш ніколі не паўтарылася.

А. МІХАЙЛАВА.



## НАШ ГОСЦЬ А. АГРАНОЎСКІ

*— Галоўнае — гэта не даць заснуць грамадскай думцы, будзіць яе і яшчэ раз будзіць..*

*Анатоль Аграноўскі, выдатны публіцыст, спецыяльны карэспандэнт «Известий», паўтарыў яшчэ раз перад студэнтамі нашага факультэта гэты лозунг.*

*Цікавасць да нашага госця з Масквы была відавочнай: мала калі актавая зала збірала столькі публікі з аднаго факультэта.*

*Яшчэ б! Сустрэча, па сутнасці, была незвычайнай. Дзесяткі пытанняў будучых журналістаў і шчырыя адказы масцітага «брата па пяру»—вось што прыкоўвала вялікую ўвагу да гэтай размовы.*

*Вопытны публіцыст расказаў аб сваёй журналісцкай практыцы, падзяліўся вопытам работы. Як выбраць тэму, распрацаваць яе, як знайсці тыповае ў сваім герої, раскрыць праблему, як карыстацца фактам?..*

*На ўсе гэтыя пытанні студэнты атрымалі лаканічныя адказы.*

*І яшчэ — перадаў сваю формулу студэнтам-журналістам Анатоль Аграноўскі — трэба думаць, добра думаць, каб прымусіць задумацца над узнятай праблемай шырокае кола чытачоў, не пакінуць яго раўнадушным.*

*— Добра піша не той, хто добра піша, а той, хто добра думае.*

*М. МАКАРЭВІЧ,*
*студэнт факультэта журналістыкі.*

**На здымках:** перад студэнтамі і выкладчыкамі выступаюць госці факультэта журналістыкі С. А. Конанаў (злева) і В. І. Аркашоў.

**Фота А. ЛАСМІНСКАГА.**



## ПАМЯТНАЯ СУСТРЭЧА

**Напярэдадні свята Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту ў гуманітарным корпусе адбылася сустрэча студэнтаў факультэта журналістыкі з былымі ваеннымі карэспандэнтамі.**

**Намеснік дэкана А. І. Раковіч коратка паведаміў аб працы журналістаў у ваенных газетах, пазнаёміў з гасцямі.**

**І вось на трыбуне С. А. Конанаў — супрацоўнік часопіса «Коммунист Белоруссии». У гэтага чалавека багаты жыццёвы вопыт. Усю вайну ён працаваў у дывізійнай газеце «В атаку». Доўгі шлях прайшла дывізія. А разам з ёю, натхняючы воінаў на подзвіг, ішла і газета. Рэдакцыйная калегія складалася з трох чалавек: рэдактара, адказнага сакратара і літаратурнага супрацоўніка. Друкарню перавозілі на возе. З вялікімі цяжкасцямі здабывалі матэрыял ваенныя карэспандэнты. Часта ім даводзілася весці барацьбу з ворагам не толькі пяром, але і штыком.**

**Колькі мужнасці і адвагі праявілі салдаты ў мінулую вайну! Кожная рота, кожны ўзвод меў свайго героя, на якога раўняліся ўсе.**

**Сідар Арцёмавіч успомніў Сашу Храбрых, які падбіў 6 нямецкіх танкаў бутылкамі з гаручай сумессю. У канцы вайны Саша трапіў у дывізію Конанава. І яны больш не разлучаліся.**

**Чалавек усё сваё жыццё вучыцца. Для адных ён настаўнік, другія для яго выступаюць у ролі педагога. Так адбылося і з Сідарам Арцёмавічам. Прыкладам для яго быў М. І. Радыёнаў, вобраз якога ён праносіць праз усё жыццё. Гэты чалавек навучыў яго мужнасці, уменню валодаць сабой у складаных абставінах. Радыёнаў заўсёды умеў знайсці патрэбнае слова, каб падбадзёрыць чалавека, натхніць на добрую справу. І загінуў Мікалай Іванавіч як герой.**

**У заключэнне Сідар Арцёмавіч пажадаў студэнтам добрай вучобы, цікавых спраў.**

**Уважліва слухалі студэнты выступленні ваенных журналістаў І. С. Аляксанава, В. І. Парфёнава і В. І. Аркашова.**

**Васіль Іванавіч Аркашоў працаваў у час вайны фотакарэспандэнтам дывізійнай газеты «Знішчым ворага». Ён зрабіў многа памятных здымкаў, у якіх расказваў аб падзеях, людзях. Хутка выйдзе ў свет кніга В. І. Аркашова, у якой будзе надрукавана звыш 200 фотаздымкаў.**

**Сустрэча закончылася. Але студэнты доўга не разыходзіліся, шчыра дзякавалі гасцям і выказвалі жаданне часцей сустракацца.**

**А. КЛОК,**
**студэнтка другога курса журфака.**

# САВЕЦКАЯ ВЫБАРЧАЯ СІСТЭМА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

там Вярхоўнага Савета СССР можа быць выбран кожны грамадзянін, які дасягнуў 23-гадовага ўзросту.

Выбарчы закон нашай краіны прадугледжвае ўсе ўмовы для найбольш поўнага ахопу ўсіх выбаршчыкаў удзелам у выбарах. Так, выбары ў нас праводзяцца ў нерабочыя дні ў працяглы перыяд часу—з 6 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара па мясцоваму часу. Выбарчыя ўчасткі ствараюцца ва ўсіх населеных пунктах, воінскіх часцях, у бальніцах, радзільных дамах, санаторыях, у паяздах дальняга руху.

**ВАЖНЕЙШЫМ ПРЫНЦЫПАМ САВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ, ЯКІ РАСКРЫВАЕ ЯЕ САПРАЎДНЫ ДЭМАКРАТЫЗМ, З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫНЦЫП РОЎНАГА ПРАВА.** «Выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі, — гаворыцца ў артыкуле 136 Канстытуцыі СССР, — кожны грамадзянін мае адзін голас: усе грамадзяне ўдзельнічаюць у выбарах на роўных асновах». Савецкая выбарчая сістэма не ведае якіх-небудзь абмежаванняў, якія б пазбаўлялі тую ці іншую групу грамадзян выбарчых правоў або давалі ёй якія-небудзь перавагі.

Кожны выбаршчык мае толькі адзін голас. Для забеспячэння сапраўднай роўнасці галасоў выбаршчыкаў на выбарах у той ці іншы Савет ствараюцца роўныя па колькасці насельніцтва выбарчыя акругі. І такім чынам кожны дэпутат Савета прадстаўляе аднолькавую колькасць насельніцтва, а голас выбаршчыка ў адной выбарчай акрузе роўны голасу выбаршчыка ў другой акрузе. Так, пры выбарах у абласныя Саветы дэпутатаў працоўных БССР адна выбарчая акруга ўтвараецца на кожныя 5 тысяч чалавек насельніцтва, аднак не менш 100 выбарчых акруг; пры выбарах у раённыя Саветы дэпутатаў працоўных адна выбарчая акруга ўтвараецца на кожныя 750 чалавек насельніцтва, аднак не менш 75 выбарчых акруг.

У ЗША, Англіі і Францыі выбарчыя акругі «выкройваюцца» так, што прыгарады, густа населеныя рабочымі, зводзяцца ў адну-дзве акругі, а ў кожным гарадскім цэнтры, населеным буржуазіяй, утвараецца да дзесятка акруг. У некаторых краінах, напрыклад, Новай Зеландыі, Аўстраліі і іншых, да гэтай пары захаваўся так званы множны вотум, адпаведна якому пэўныя катэгорыі выбаршчыкаў карыстаюцца на выбарах аднаго і таго ж органа ўлады не адным, а некалькімі галасамі (да 5 галасоў) у залежнасці ад колькасці жывёлы або другой маёмасці, што знаходзіцца ў іх уладанні.

**ДЭМАКРАТЫЗМ САВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ ПРАЯЎЛЯЕЦЦА І Ў ТЫМ, ШТО ВЫБАРЫ ВА ЎСЕ САВЕТЫ,** пачынаючы ад сельскага Савета і канчаючы Вярхоўным Саветам СССР, **З'ЯЎЛЯЮЦЦА ПРАМЫМІ.** Гэта азначае, што ўсе дэпутаты выбіраюцца грамадзянамі непасрэдна, а не праз якіх-небудзь выбаршчыкаў або ўпаўнаважаных. Прамыя выбары ўзмацняюць сувязь органаў улады з выбаршчыкамі, забяспечваюць дзейсны кантроль народа за работай выбраных імі дэпутатаў, павышаюць адказнасць дэпутатаў перад выбаршчыкамі.

Формай пазбаўлення працоўных капіталістычных краін ад непасрэднага ўдзелу ў выбранні органаў улады з'яўляюцца шматступенныя, або ўскосныя выбары, пры якіх не самі выбаршчыкі, а калегіі выбаршчыкаў «выбіраюць» дэпутатаў у вышэйшыя ўстановы.

**АДЛЮСТРАВАННЕМ САПРАЎДНАГА ДЭМАКРАТЫЗМУ САВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТАЙНАЕ ГАЛАСАВАННЕ** на выбарах, якое забяспечвае поўную магчымасць для кожнага выбаршчыка свабодна і беспарашкодна выказаць сваю волю. Тайнае галасаванне з'яўляецца сур'ёзным спосабам крытыкі і кантролю работы дэпутатаў з боку выбаршчыкаў, формай праверкі сувязі органаў дзяржаўнай улады з масамі. Тайнае галасаванне дапамагае дзяржаве выяўляць слабыя ўчасткі ў рабоце асобных яе органаў.

Канстытуцыі і выбарчыя законы буржуазных дзяржаў таксама змяшчаюць артыкулы, якія фармальна абвяшчаюць тайнае галасаванне. Аднак тайна галасавання з'яўляецца фікцыяй, таму што яна на справе не забяспечваецца і парушаецца на кожным кроку шляхам палітычнага і эканамічнага націску на выбаршчыкаў, подкупу, абману, розных махінацый пры падліку галасоў і г. д. Якая можа быць тайна галасавання, калі ў многіх штатах ЗША, у Англіі і некаторых іншых капіталістычных краінах на выбарчых бюлетэнях і на карашках ставяцца нумары, а ў Японіі выбаршчык павінен падпісаць сваё прозвішча на бюлетэні?

**ВЫЯЎЛЕННЕМ САПРАЎДНАГА ДЭМАКРАТЫЗМУ САВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПАРАДАК ВЫСТАЎЛЕННЯ КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ** як грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных, так і агульнымі сходамі рабочых, калгаснікаў і служачых. Такім чынам, самі працоўныя ўдзельнічаюць у вылучэнні кандыдатур у дэпутаты і абмеркаванні гэтых кандыдатур.

Увесь савецкі выбарчы закон пранізвае думка аб прыцягненні працоўных да актыўнага непасрэднага ўдзелу ў арганізацыі і правядзенні выбараў. Працоўныя ствараюць са сваіх прадстаўнікоў выбарчыя камісіі (участковыя, акружныя і г. д.), якія кіруюць выбарамі на сваёй тэрыторыі. Вялікая маса актывістаў праводзіць агітацыйную работу, работу па складанню і праверцы спісаў выбаршчыкаў, па арганізацыі розных сходаў, сустрэч і гутарак. У выбарчых кампаніях у якасці агітатараў і арганізатараў выбараў у Саветы ўдзельнічае прыкладна 14—15 млн. чалавек, што гаворыць аб сіле сацыялістычнай дэмакратыі, аб рэальным удзеле мільёнаў савецкіх людзей у практычным вырашэнні важнейшых пытанняў грамадскага і палітычнага жыцця.

**ВАЖНЕЙШЫМ ПРЫНЦЫПАМ САВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПРАВА НА АДКЛІКАННЕ ДЭПУТАТАЎ, ЗАМАЦАВАНАЕ Ў КАНСТЫТУЦЫІ СССР,** у Канстытуцыях саюзных рэспублік і спецыяльных законах.

Е. ТАГУНОЎ,
кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва.

**КІНО**

# «БРАТЫ КАРАМАЗАВЫ»

Нядаўна мы маглі толькі чытаць раман Ф. М. Дастаеўскага, а зараз бачым яго ў інтэрпрэтацыі І. А. Пыр'ева. Ці ўзбагацілася ад гэтага наша ўяўленне аб пісьменніку і яго рамане? Ці ўбачылі мы ў ім што-нёбудзь новае, пыр'еўскае? Толькі так, здаецца, трэба падыходзіць да экранізацыі класічных твораў. Рэжысёр мае права ўключаць або выключаць асобныя раздзелы, вобразы з рамана, твора, але тое, што ён прапануе гледачу, павінна быць самастойным, высокамастацкім. Існуе адзін раман Ф. М. Дастаеўскага, а інтэрпрэтацый яго можа быць мноства. І ў кожнай з іх павінен быць Ф. М. Дастаеўскі, зразумела, скажам І. Пыр'евым, а не проста І. Пыр'еў.

У новым фільме Ф. М. Дастаеўскага мы адчуваем. Адчуваем перш за ўсё лепшае ў вялікім пісьменніку, але не ўсё. Ды, зрэшты, і гэта не бяда. Не бяда, калі з кінафільма зусім выключаны вобразы Хахлаковай, яе дачкі Лізы, а таксама хлопчыкаў і капітана Снегірова: і без іх асноўная думка выказана, дзеянне не траціць сваёй дынамікі і змястоўнасці. Бяда, калі сама логіка развіцця асноўных вобразаў вымагае інсцэніроўкі тых ці іншых эпізодаў, раздзелаў з рамана, а іх няма. І яшчэ бяда, калі аўтары захапляюцца пераказам, а не паказам. Гэта асабліва адчувальна ў сцэне размовы Івана з Аляксеем у тракціры. Іван расказвае аб тым, як пан зацкаваў маленькага хлопчыка сабакамі. Вось бы паказаць, «разгарнуць» гэты ўчынак дэспата, а пасля і вокліч-адказ ціхоні Алёшы: «Расстраляць!» Эпізод быў бы яшчэ больш уражлівым і матывіраваным.

Паказаць можна было б і «Вялікага інквізітара»—паэму Івана, бо яго вобраз без яе выглядае значна збедненым. Тым больш, што ў гэтым сэнсе ў нас ужо ёсць пэўныя традыцыі, звычкі: устаўныя эпізоды, паказ расказваемага героем часта сустракаецца, напрыклад, у казачна-міфалагічных фільмах, прызначаных для дзяцей. Гэта неабходна таксама для «разрадкі» і так занадта напружанага дзеяння. Тады нават вобраз Кацярыны Іванаўны атрымаўся б больш цікавым і дзейсным, асабліва калі б была паказана сцэна яе прыходу да Дзмітрыя за грашыма, каб выратаваць бацьку. Бо яна ж, гэтая сцэна, мае такое вялікае значэнне ў лёсе герояў! Кацярына Іванаўна яўна «пакрыўджана» ў фільме, з галоўнай гераіні янаператварылася ў другарадную. Ёй прыдадзена нейкая функцыянальная роля. Не вінавата ў гэтым і артыстка С. Каркоша: у яе было вельмі мала кінематаграфічнага матэрыялу.

Суд, наогул, не ўдаўся ў фільме. Няма ні яго старшыні, ні такога цікавага ў Ф. М. Дастаеўскага пракурора, ні таленавітага адваката Фецюковіча. Не «разыграна» іх судзейская логіка, якая нагадвае «палку а двух канцах». Дакладней кажучы, твары, фігуры іх ёсць, але няма іх як людзей. Суд, магчыма, забраў бы цэлую серыю, але ён варты яе, бо без яго нельга зразумець трагізм лёсу Дзмітрыя і лёсу чалавека наогул у бюракратычнай дзяржаве, такі трагізм, як паказаў яго Ф. М. Дастаеўскі.

Аўтары фільма маглі б зрабіць гэта. Удалося ж ім перадаць уласцівае для Ф. М. Дастаеўскага «многагалоссе» і спрэчкі ў момант сустрэчы ўсіх Карамазавых у старца Зосімы або, скажам, драматычны лірызм апошняй ночы — ночы кахання Дзмітрыя і Грушанькі. А возьмем сцэну размовы Івана са сваім «двайнікам»-чортам.

Іван, які пакутліва змагаецца са сваім хворым сумленнем і падступаючым вар'яцтвам, прывалокся дадому, шпурнуў паліто на крэсла, затым усеўся на дыван і пільна ўглядаўся ў куток, туды, дзе ляжыць паліто. І раптам рукаў паліто ўпаў, заварушыўся. Удалая знаходка! Бо далей мы ўжо з поўнай даверлівасцю і ўзрушанасцю глядзім, як у крэсле з'явіўся, загаварыў яго «двайнік»-чорт. Пераканаўча, рэалістычна!

Вельмі цікавыя ў фільме імпульсіўны Дзмітрый у жывым выкананні М. Ульянава, інтэлектуальны Іван у трактоўцы К. Лаўрова, разбэшчаны і хітры Фёдар Карамазаў, увасоблены М. Прудкіным. Шкада, што жаночым вобразам не пашанцавала. Гэта датычыцца не толькі Кацярыны Іванаўны, але і Грушанькі, якая ў фільме ідэалізавана. Яна ў выкананні Л. Пыр'евай ледзь не здзяйсняе вялікі грамадзянскі подзвіг, суправаджаючы «катаржніка» ў яго ссылку. Сцэна зусім лішняя. Яе, дарэчы, няма і ў Ф. М. Дастаеўскага.

Ва ўсім астатнім фільм «Браты Карамазавы» — несумненная ўдача нашага кінамастацтва.

**І. ШПАКОЎСКІ,**
**дацэнт кафедры рускай класічнай літаратуры.**





## РАЗВІТАННЕ З ЗІМОЙ

*Непакорная (здымак злева).*
*Фота А. БРАГІНЦА.*
*Яшчэ холадна.*
*Фота С. СУПРУНА.*

# РАМАНЫ НА КАНВЕЕРЫ

Восем гадзін раніцы. Швейцарскі гарадок на беразе Жэнеўскага возера прачынаецца. Ажывае і вялікі белы будынак, які падобны на паліклініку, але прадстаўляе ў сапраўднасці сучаснае, хоць і не зусім звычайнае прадпрыемства. У гэтым доме-прадпрыемстве 40 пакояў, 7 тэлевізараў, адкрыты басейн для плавання, 5 аўтамашын, фотакапіравальная машына для размнажэння рукапісаў, электрапральня і аўтаматызаваная кухня. Кожную раніцу тут збіраецца ўвесь яго штат, які складаецца з 12 служачых.

Гаспадар прадпрыемства — вядомы французскі пісьменнік Жорж Сіменон. Выпускаемая прадукцыя — яго кнігі, якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў краіне і за мяжой. Раманы Сіменона выдадзены ў 31 краіне на 28 мовах агульным тыражом каля 300 мільёнаў экземпляраў. Каб карціна была паўнейшай, дабавім, што каля 60 раманаў пісьменніка экранізавана, а сюжэты 76 твораў выкарыстала ў сваіх перадачах тэлебачанне ЗША, Англіі, Японіі, Даніі, ФРГ, Нарвегіі і іншых краін.

Галоўны персанаж паліцэйскіх раманаў Ж. Сіменона сышчык Мегрэ стаў не менш вядомым, чым Шэрлок Холмс Конан Дойла. Французскі часопіс «Пары-матч» паведамляе, што ў цяперашні час прадпрыемства Сіменона рыхтуе да выхаду ў свет 199-ы раман «Адпраўны пункт Мегрэ», а вясной гэтага года выйдзе двухсоты раман «Ёсць яшчэ арэхавыя дрэвы».

Часопіс «Пары-матч» іранічна заўважае з выпадку індустрыялізацыі творчасці Сіменона, што, магчыма, у цяперашні час пісьменнік марыць аб будучым робаце-намесніку, здольным пісаць яго будучы раман, і аб калькуляцыйнай машыне для складання дакладнай бібліяграфіі яго твораў.

**Ю. БАБАЯНЦ.**

# ГУМАР, народжаны сесіяй

**Прафесар-ларынголаг пытае студэнта. Студэнт на момант задумаўся, а пасля гаворыць:**
**— Гэта пытанне датычыцца горла, а я збіраюся быць спецыялістам толькі носа.**
**— Вось яно што! А якою ноздраю вы збіраецеся займацца ў прыватнасці!**

* * *

**Студэнт, які закончыў курс навук, развітваючыся з прафесарам, шчыра дзякаваў за ўсё добрае, а пасля дадаў:**
**— Вам я абавязан усім, што я ведаю.**
**— Даруйце,— сказаў прафесар таксама шчыра,— ці варта дзякаваць за такую дробязь!**

* * *

**ПРАФЕСАР: Які народ з гісторыі вам найбольш падабаецца!**
**СТУДЭНТ: Фініліяны.**
**ПРАФЕСАР: Чаму!**
**СТУДЭНТ: Таму, што найменш гаворыцца пра іх.**

* * *

**— Чаму вы так хвалюецеся! Баіцеся маіх пытанняў!**
**— Ды не, прафесар, я баюся сваіх адказаў.**

* * *

**ПРАФЕСАР: Якая розніца паміж святлом і электрычнасцю!**
**СТУДЭНТ: Першае нічога не каштуе.**


## АБ'ЯВА

**Калектыў школы № 20 запрашае былых выпускнікоў на традыцыйны вечар сустрэчы, які адбудзецца 6 сакавіка а 18-й гадзіне ў актавай зале школы.**

**Дырэкцыя.**


## Спорт

# ПРАВЕРКА БОЕМ

Звыш 70 удзельнікаў сабраліся на мінулым тыдні ў святочна ўпрыгожанай гімнастычнай зале галоўнага корпуса універсітэта на матчавую сустрэчу па фехтаванню паміж камандамі БДУ, інстытута фізкультуры, спартыўнага клуба арміі, Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута і Днепрапятроўскага хіміка-тэхналагічнага інстытута.

Спаборніцтвы пачаліся ўрачыстым парадам удзельнікаў, абменам значкамі і сувенірамі. Шматлікія гледачы цёпла віталі гасцей і гаспадароў.

Мужчыны змагаліся на рапірах, шаблях і шпазе, жанчыны — на рапірах.

Лепш за ўсіх выступіла каманда інстытута фізічнай культуры. Яна заняла агульнае першае месца. На другім месцы Днепрапятроўскі хіміка-тэхналагічны інстытут, на трэцім — спартыўны клуб арміі, чацвёртае месца заняла першая каманда універсітэта, на пятым месцы медыцынскі інстытут і на шостым — другая каманда універсітэта.

Некалькі слоў хочацца сказаць аб нашай камандзе. За апошнія гады закончылі універсітэт і выйшлі з калектыву майстры спорту Лівшыц, Гарбар, Фёдараў, выйшла некалькі першаразраднікаў, якія абаранялі гонар універсітэта на розных спаборніцтвах. У цяперашні час ідзе працэс абнаўлення каманды. У яе саставе спартсмены II і III разрадаў, у асноўным студэнты першага-другога курсаў. У прайшоўшых спаборніцтвах мы ставілі мэту праверыць моладзь у сустрэчы з першаразраднікамі і майстрамі спорту. І трэба адзначыць, што гэту праверку нашы шпажысты - першаразраднік А. Нечыпарэнка, Ю. Собалеў, А. Прахарэнка вытрымалі з гонарам, заняўшы першае месца.

А ўвогуле каманда, як і меркавалася, выступіла не лепшым чынам.

**В. ХРЭНАЎ,**
**галоўны суддзя сустрэчы.**

# ПАЦВЕРДЗІЛІ ТЫТУЛ МАЦНЕЙШЫХ

Два дні на стадыёне «Працоўныя рэзервы» спаборнічалі канькабежцы універсітэта. Надвор'е не спрыяла спартсменам — быў моцны вецер. І гэта, безумоўна, уплывала на вынікі напружанай барацьбы.

Права падняць флаг спаборніцтваў прадастаўляецца чэмпіёнам універсітэта 1968 года Ніне Матусевіч (III курс хімфака) і Барысу Гігевічу (IV курс геафака).

Мужчыны спаборнічалі на дыстанцыях 500, 1500 і 3.000 метраў.

Званне мацнейшага пацвердзіў Б. Гігевіч, ён выйграў усе тры дыстанцыі. На другім месцы па суме трох дыстанцый М. Русак (II курс матэматычнага факультэта). На трэцім месцы А. Андрэеў (І курс фізічнага факультэта).

У дзяўчат на ўсіх трох дыстанцыях першынство трымала Ніна Матусевіч. Яна таксама пацвердзіла званне мацнейшай і зноў стала чэмпіёнкай універсітэта. На другім месцы па суме трох дыстанцый (500, 1000, 1500 м) — Лена Зуеўская (III курс філфака); на трэцім — Оля Балакай (II курс хімічнага факультэта).

Паміж факультэтамі месцы размеркаваліся наступным чынам: I — геафак, II — хімфак, III — матфак, IV — фізфак, V —юрфак, VI — журфак, VII — філфак, VIII — біяфак, IX — гістфак.

**В. СЯМЁНАВА.**


Адказны рэдактар **М. І. ІОСЬКА.**

АТ 04098 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т. 22-07-19. Тыраж 2000 экз. Тыпаграфія выдавецтва «Звязда».** Зак. 334.